# У ГОНАР ПРАФЕСАРА

■ У сераду ў галоўным корпусе каля Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта адбылося ўрачыстае адкрыццё памятнай дошкі ў гонар доктара тэхнічных навук, прафесара Генрыха Мікалаевіча Абаева, які ўзначальваў кафедру хімічнай тэхнікі на працягу 20 гадоў і ўнёс неацэнны ўклад у развіццё нафтахімічнай галіны і падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў для Рэспублікі Беларусь.

Удзел у мерапрыемстве прынялі прарэктар па навуковай працы Дзмітрый Глухаў, дэкан інжынерна-тэхнічнага факультэта Андрэй Кульбей, супрацоўнікі кафедры хімічнай тэхнікі і аховы працы, а таксама вучні Генрыха Мікалаевіча.